# ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

Кастрычнік 2008, № 1

Рэдкалегія:
Васіль Бароніч,
Марыйка Караткевіч,
Антось Валькоў.

Наклад: 250 асобнікаў

Друкуецца на ксэраксе

Мова выдання: беларуская, руская

Распаўсюджваецца бясплатна

Кантакты:
e-mail: dzfby@i.ua
сайт: www.ciwr.or


## "Дробныя хуліганы" судяцца з Берасцейскім гарвыканкамам.



**17 кастрычніка старшыня суда Ленінскага раёна Берасця Пётр Баброўскі пачаў разгляд каргі 19-ці так званных "дробных хуліганаў" - грамадскіх актывістаў, якія ў розныя часы адсядзелі за кратамі ў ізалятары часовага утрымання.**

У суд прыйшлі 6 чалавек: Раман Кісляк, Уладзімір Вялічкін, Рыгор Бакіевіч, Валянцін Лазарэнкаў, Сяргей Вакуленка, Дзяніс Турчаняк. Астатнія даручылі прадстаўляць іх інтарэсы Р.Кісляку або разглядаць справу без іх.

Яшчэ летам яны падалі заяву на правядзенне марша на працягу невялікага кавалку цэнтральнай вуліцы Савецкай. Але намеснік гарвыканкама Вячэслаў Хафізаў адказаў, што марш "дробных хуліганаў" не дазваляецца, таму што па адпаведнаму рашэнню гарадскіх уладаў адзіным месцам для правядзення масавых мерапрыемстваў вызначаны толькі стадыён "Лакаматыў", які ў "глыбінцы" горада. Аднак у тым жа рашэнні гаворыцца, што стадыён - не для вулічных шэсцяў і дэманстрацый.

Юрыст гарвыканкама Ірына Барысюк мусіла прызнала, што адпаведнага калегіяльнага рашэння гарвыканкама не было, а быў адказ службовай асобы. Мала таго, спаслалася на тое, што, маўляў, ў той час вуліца Савецкая была закрытая на рэканструкцыю. Але як высвятлілі актывісты, па дадзеных заказчыка рэканструкцыі - упраўлення капітальнага будаўніцтва гарадскога ЖКГ - кавалак вуліцы ад вул. Маякоўскага да вул.Пушкінскай, дзе планаваўся марш "дробных хуліганаў" - быў прыняты ў эксплуатацыю па акту дзяржкамісіі напярэдадні падачы заявы (25 чэрвеня).

На думку праваабаронцы У.Вялічкіна, пазыцыя гарвыканкама выглядае як неўдалая спроба вывернуцца з пікантнай сітуацыі.

http://spring96.org

**P.S.** *Сытуацыю камэнтуе праваабаронца Алесь Бяляцкі:*
*"Сама ідэя мне вельмі падабаецца, бо яна больш нагадвае флэш-моб. Марш "дробных хуліганаў" – ён абвастрае гэтую праблему і паказвае ўсю абсурднасьць вось гэтых амаральных паводзінаў уладаў Беларусі. Думаю, канечне, што ўлады будуць старацца, асабліва зараз, падчас выбарчай кампаніі, не дапусьціць такую акцыю".*

## Разагнана акцыя ў абарону дрэваў

У Горадні прайшла акцыя ў абарону дрэваў на старой алеі ў гістарычным квартале. Умяшалася міліцыя. Як паведаміў Эдвард Дзьмухоўскі, яго пратрымалі ў пастарунку больш за паўтары гадзіны, склаўшы пратакол аб дробным хуліганстве. На Ігара Лапеху і Надзею Крапівіну міліцыянты напісалі па два пратаколы — за дробнае хуліганства і за непадпарадкаваньне.

Трох актывістаў затрымалі падчас іхняга пратэсту супраць высечкі дзевяці дрэваў у завулку Тэлеграфным.

Удзельнікі пратэсту лічаць, што дрэвы не былі ў аварыйным стане, хаця дазвол на высечку дала адмысловая гарадзкая камісія. Актывісты мяркуюць, што за апошні час у горадзе, у тым ліку сярод гістарычнай забудовы, было спляжана зашмат дрэваў, ня ўсе зь якіх былі аварыйнымі. З грамадзкасцью ў гэтай справе пагатоў ніхто ня раіцца, кажуць яны.

Міліцыянты сказалі, каб тры актывісты чакалі позваў у суд.



## Наблюдатели ОБСЕ не признали «выборы» в Беларуси

**Миссия наблюдателей БДИПЧ ОБСЕ не признала «парламентские выборы» в Беларуси свободными и демократическими, сообщает Хартия`97. Наблюдателями ОБСЕ отмечен «плохой или неудовлетворительный» процесс подсчета голосов в 50% случаев. 40% наблюдателей говорили, что у них не было возможности в полной мере оценивать процесс подсчета голосов. Выборы однозначно не соответствовали стандартам ОБСЕ.**

«Рекомендации ОБСЕ не были выполнены. По оценкам наблюдателей подсчет голосов происходил в закрытом режиме. Наблюдателей не допускали к подсчету голосов, был усложнен сам процесс наблюдения за «выборами», были замечены случаи фальсификации итогов голосования. У нас есть основания считать, что осуществлялся строгий административный контроль за избирательным процессом. Целью избирательной кампании является предоставление выбора избирателям. Но свобода избирателей была ограничена властями Беларуси», — заявила глава миссии краткосрочных наблюдателей ОБСЕ, вице-президент Парламентской Ассамблеи ОБСЕ Анн-Мари Лизен.

«Треть наблюдателей говорили о том, что им не был предоставлен допуск к наблюдению, 40% наблюдателей говорили, что у них не было возможности в полной мере оценивать процесс подсчета. Очень низкий уровень видимости избирательной кампании. Белорусским властям необходимо осуществлять перемены, чтобы страна стала на путь демократизации и прогресса», — отметила вице-президент ПА ОБСЕ Анн-Мари Лизен.

Глава миссии наблюдателей БДИПЧ ОБСЕ Герт-Хинрих Аренс заявил, что разочарован ходом и итогами «парламентских выборов» в Беларуси. По его словам, «на протяжении многих годов наблюдается отсутствие прозрачности «выборов» в Беларуси». Аренс отметил, что наблюдатели ОБСЕ зафиксировали нарушения во время всех этапов избирательной кампании.




*«Ясные сигналы по улучшению избирательного процесса не были реализованы; потребуются значительные улучшения, если Беларусь собирается проводить подлинно демократические выборы в соответствии с общими обязательствами в рамках ОБСЕ. К сожалению, повторяющиеся сигналы доброй воли, по всей видимости, не были корректно поданы или получены. В итоге, значительный прогресс в демократическом развитии Беларуси, на который мы надеялись, не осуществился»,* — отметила вице-президент ПА ОБСЕ и Специальный координатор краткосрочных наблюдателей ОБСЕ, Анн-Мари Лизен.

# Акция в память о насильственно исчезнувших белорусах



30 августа, в Международный день исчезнувших людей, гражданская инициатива «Мы помним» провела в Амстердаме акцию памяти насильственно исчезнувших Юрия Захаренко, Виктора Гончара, Анатолия Красовского, Дмитрия Завадского.

Акция памяти прошла с 14:00 до 15:00 по местному времени на центральной площади Амстердама Leidseplein. Мероприятие было санкционировано местными властями.

Участники мирной демонстрации держали банер с портретами Юрия Захаренко, Виктора Гончара, Анатолия Красовского, Дмитрия Завадского и подписью «Насильственно исчезли в Беларуси», а также связку белых и голубых воздушных шаров с прикрепленными к ним фотографиями исчезнувших белорусов.

В конце акции ее участники отпустили воздушные шары, и портреты Юрия Захаренко, Виктора Гончара, Анатолия Красовского, Дмитрия Завадского взмыли в небо.

Эта скромная, но красивая акция вызвала интерес у прохожих, которых в этот солнечный день в центре Амстердама было огромное количество. Многие люди подходили к участникам акции, расспрашивали, чему она приурочена, задавали вопросы о ситуации в Беларуси, выражали свою солидарность с теми, кто добивается правды о насильственных исчезновениях.
Первыми насильственные исчезновения стали применять немецкие нацисты во время Второй мировой войны. В 60-х годах правительства таких латино-американских стран, как Гватемала, Сальвадор, Гондурас, Мексика, Колумбия, Перу, Боливия, Бразилия, Чили, Аргентина, Уругвай и Гаити переняли чудовищную практику недобровольных исчезновений. Позже тираны некоторых африканских и азиатских стран также стали применять бесчеловечную практику недобровольных исчезновений.

«Последний диктатор Европы» воспользовался жестоким, ужасающим методом, который разработали нацисты: в 1999 году в Беларуси насильственно исчезли три известных человека — бывший министр внутренних дел Юрий Захаренко, вице-спикер Верховного Совета XIII созыва Виктор Гончар, крупный предприниматель Анатолий Красовский. Всех этих людей объединяло одно: они были открытыми оппонентами режима Лукашенко. Летом 2000 года бесследно исчез бывший личный оператор Лукашенко Дмитрий Завадский. О судьбе Юрия Захаренко, Виктора Гончара, Анатолия Красовского и Дмитрия Завадского их родным и близким до сих пор ничего не известно.

Пресс-служба CIWR.ORG

# 30 жніўня адбыліся акцыі памяці зьніклых

ОРША:



30 жніўня ў Оршы прайшла акцыя прысьвечаная міжнароднаму дню зніклых. Актывісты мясцовых моладзевых арганізацый прайшліся па ўсіх мінірынках гораду, дзе раздавалі мінакам незалежную газэту “Народная воля” й тэксты Дэкларацыі і Канвенцыі супраць гвалтоўных знікненьняў.

Не зважаючы на даволі дрэннае надвор'е ў Оршы, акцыя прайшла пасьпяхова. Бо выклікала жывы інтарэс у мінакоў. Маладзёнам давялося шмат распавядаць пра Канвенцыю аб гвалтоўных зьнікненьнях й пра зніклых беларускіх палітыкаў. На мінірынку па вуліцы Леніна з пакупнікоў утварылася нешта кшталту мітынгу. Каля дзесяці чалавек абступілі моладзевых актывістаў і слухалі расповед пра Канвенцыю аб гвалтоўных зьнікненьнях.

БЕРАСЬЦЕ:



У Берасьці ў Міжнародны дзень зніклых людзей 30 жніўня некалькі маладых чалавек на рынку “Юбілейны” раздавалі мінакам і прадпрымальнікам брашуркі з тэкстам “Канвенцыі ААН аб абароне людзей ад гвалтоўных зьнікненьняў”. Усім зацткаўленям, маладыя людзі распавядалі пра сэнс Канвенцыі і што яны праводзяць гэтую акцыю з мэтай далучэньня Беларусі да гэтай Канвенцыі.

Разам з тэкстам Канвенцыі наведвальнікі і прадпрымальнікі берасьцейскага рынку “Юбілейны” атрымалі апошні нумар газэты “Народная воля”.

БАБРУЙСК:



Учора, 30 жніўня ў міжнародны дзень зьніклых людзей, у Бабруйску адбылася акцыя па раздачы адмысловых брашураў з тэкстам “Канвенцыі супраць гвалтоўных зьнікненьняў”.
Кніжачкі раздаваліся моладзевымі актывістамі з мясцовага аддзяленьня міжнароднай грамадзкай арганізацыі "Малады Фронт".

Акцыя праходзіла ў фармаце шпацыру групы маладых людзей па галоўных вуліцах Бабруйска ў цэнтры горада. Падчас раздачы моладзевыя актывісты тлумачылі гараджанам аб праблемах гвалтоўнага зьнікненьня людзей ня толькі ў сьвеце але і ў нашай Беларусі. Грамадзяне тым часам актыўна падтрымлівалі дысусыі і вказвалі свае меркаваньні адносна прычынаў дадзенай праблемы. Былі закранутыя такія пытаньні як зьнікненьні людзей, у здавалася б ціхай і мірай Беларусі, такіх вядомых людзей як міністар унутраных справаў Юрый Захаранка, палітыкі Анатоль Красоўскі і Віктар Ганчар, журналіст Зьміцер Завадзкі.

www.zavadsky.org

# Верховный суд отказал в удовлетворении жалобы активисту Андрею Шарендо.



Верховный суд отказал в удовлетворении жалобы брестскому активисту оппозиции Андрею Шарендо, оштрафованному за участие 21 января 2008 года в акции протеста предпринимателей в Минске.

Как сообщил **БелаПАН**_правозащитник Роман Кисляк, активист обжаловал постановление суда Центрального района Минска, который 22 января признал Шарендо виновным по ст. 23.34 КоАП (нарушение порядка организации или проведения массового мероприятия или пикетирования) и оштрафовал на 50 базовых величин (1 млн. 750 тыс. рублей), а также Минского городского суда по данному делу. Последний оставил решение райсуда без изменения, а жалобу активиста оппозиции без удовлетворения.

Андрей Шарендо, по мнению которого, эти решения незаконны, необоснованны, а также нарушают его гражданские права, в том числе право на свободное выражение мнения и на мирное собрание, направил жалобу в Верховный суд.

Как следует из ответа, полученного Шарендо из Верховного суда, оснований для удовлетворения его жалобы и отмены постановлений судов нет. Верховный суд считает, что своими действиями активист оппозиции нарушил порядок проведения массовых мероприятий, а его несогласие с установленными ограничениями на их проведение отвергнуто обоснованно, поскольку оно не влияет на совершенное им противоправное деяние, за которое установлена административная ответственность.

"Активист оппозиции не удовлетворен таким ответом и намерен направить индивидуальное сообщение о нарушении своих прав в Комитет ООН по правам человека", — проинформировал правозащитник.

# Сяржука Бахуна дапыталі па справе аб выбуху ў Менску 17.10.2008

**Сяброўства ў апазыцыйнай партыі стала прычынай для допыту па справе аб выбуху ў Менску грамадзкага актывіста й сябра партыі БНФ Сяржука Бахуна.**



Сяржука Бахуна выклікалі на допыт у аддзел крымінальнага вышуку Ленінскага РАЎС горада Берасьця на 17 кастрычніка. Запрасілі актывіста на допыт некалькі дзён таму, патэлефанаваўшы на мабільны тэлефон. Расказвае сам Сяржук Бахун.

С. Бахун: “Я запытаў, чаму крымінальны вышук хоча са мною сустрэцца, што здарылася? Мне адказалі, што па справе выбуху ў Менску на 3 ліпеня, на гэтак званы Дзень Незалежнасьці. Я запытаў, чаму менавіта са мною. Яны сказалі: “Вы ж зьяўляецеся сябрам якой-небудзь апазыцыйнай арганізацыі?” Я сказаў, што так, што я сябра партыі БНФ. Яны сказалі, што таму мы хочам з вамі сустрэцца. Я сказаў: “Добра”.

Сяржук Бахун, які жыве з жонкай Сьвятланай Завадзкай у Менску, прыехаў на допыт па справе аб выбуху ў горад Берасьце. Ён прыняў рашэньне не чакаць афіцыйнай позвы.

С. Бахун: “Фармальна, я мог бы не ісьці. Але прыняў рашэньне ісьці. Я, як любы чалавек, нармальны беларус, хачу каб гэтая справа аб выбуху была раскрытая, каб злачынцы былі знойдзеныя й пакараныя. І я заўсёды гатовы дапамагчы”.

Капітан крымінальнага вышуку задаў шэраг пытаньняў, каб высьветліць, дзе актывіст быў у дзень выбуху, пацікавіўся, ці ёсьць у яго родныя й блізкія ў Менску, а таксама запытаўся, якая адзнака па хіміі была ў спадара Бахуна ў школе. Па словах С. Бахуна, увесь дзень ён знаходзіўся разам з жонкай у менскай кватэры. Быў выходны дзень, а масавая гулянка для яго не прадстаўляла цікавасьці. Пасьля допыту грамадзкі актывіст дзеліцца сваімі думкамі.

С. Бахун: “Калі для іх прычына, што я – сябра партыі БНФ, то яны любую іншую прычыну могуць знайсьці. Ня ведаю, што такога кепскага – партыя БНФ афіцыйна зарэгістраваная арганізацыя. Гэта маё меркаваньне, але я думаю, дзяржава ведае, хто стаіць за справай гэтага выбуху. Пытаньне з раскрыцьцём яна проста цягне па той прычыне, каб скарыстацца гэтым выбухам і каб дапытаць, напрыклад, апазыцыянэраў. Такое ўражаньне, што яны проста хочуць скарыстацца гэтай магчымасьцю: з кім паразмаўляць, каго дапытаць, у каго вобыск правесьці. Для ўлады гэтая справа – чарговы інструмэнт у руках. Напрыклад, тая ж справа з выбухам, якая была ў Віцебску, калі, мы памятаем , і апазыцыянэраў цягалі, і хлопцы ў СІЗО сядзелі. А пасьля за выбух у Віцебску былі прыцягнутыя да адказнасьці афіцэры беларускіх спэцслужбаў”.

Нагадаю, што па справе аб выбуху ў Менску выклікаюць на допыты грамадзкіх актывістаў, журналістаў, праваабаронцаў і сябраў апазыцыйных партый па ўсёй рэспубліцы.

Рада Міровіч